МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

3 верасня 2021 г. № 34 (619)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АКЦЭНТЫ

# «МЫ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЬ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ ПАТРЫЁТАМІ»

## 1 верасня для сенатараў выдалася вельмі насычанае: яны ўдзельнічалі ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных Дню ведаў









Фота БелТА.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА адкрывала пасля рэканструкцыі сталічную гімназію № 25, што ў Заводскім раёне. Школа была адкрытая яшчэ ў 1957 годзе, таму зразумела, што маральна і фізічна ўстарэла. У 2017–м гарадскімі ўладамі было прынята рашэнне аб яе рэканструкцыі. За гэты час стары неатынкаваны будынак з белай цэглыператварыўся ў новабудоўлю. Сёння гімназія складаецца з двух асобных карпусоў, злучаных галерэямі. Другі, дарэчы, пабудавалі з нуля, і цяпер агульная плошча ўстановы адукацыі складае 17,5 тысячы метраў.**

Больш падрабязна аб наведванні спікерам Савета Рэспублікі сталічнай гімназіі мы пісалі ўчора (у № 168 ад 2 верасня).

Не абмінулі ўвагай сенатары і іншыя куткі краіны, дзе 1 верасня прагучалі першыя званкі для першакласнікаў і іншых навучэнцаў.

Так, **намеснік старшыні Анатоль ІСАЧАНКА** ў Дзень ведаў наведаў магілёўскую гімназію № 3. На ўрачыстай лінейцы ён пажадаў вучням, іх бацькам і настаўнікам узаемных павагі і разумення:

— Першае верасня — асаблівы дзень для першакласнікаў і іх бацькоў. Яны рыхтаваліся да гэтага дня, а цяпер хвалююцца: за якую парту пасадзяць, які будзе настаўнік. А ў тых, хто ідзе ў 11-ы клас, — іншыя чаканні. Хтосьці ўжо вызначыўся, куды будзе паступаць. Гэта час, калі маладыя людзі на парозе дарослага жыцця. І я хацеў бы пажадаць бацькам і настаўнікам, каб вы клапаціліся не толькі пра тое, каб даць дзіцяці веды, але і выхаванне. Мы павінны выхоўваць нашых дзяцей патрыётамі. А гэта значыць — любіць свой дом, сваю вуліцу, свой горад і сваю Радзіму.

Віцэ-спікер верхняй палаты парламента ўручыў гімназіі сертыфікат, а кожны з першакласнікаў атрымаў у падарунак ад Прэзідэнта кнігу «Беларусь — наша Радзіма».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** у гэты святочны дзень брала ўдзел ва ўрачыстай лінейцы ў ліцэі МУС.

У сваім прывітальным слове парламентарый пажадала педагогам прафесійных поспехаў, мудрасці і цярпення, вучням — настойлівасці, выдатных адзнак і творчасці ў надыходзячым навучальным годзе.

— Перакананая, што вам па сілах пераадолець усе цяжкасці, стаць па-сапраўднаму адукаванымі людзьмі і ўнесці свой уклад у развіццё роднай Беларусі, — падкрэсліла яна ў завяршэнне.

Не абышлося і без сюрпрызаў — сенатар падарыла ліцэістам ровары айчыннай вытворчасці.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** павіншаваў са святам гімназістаў Кобрына і сустрэўся з педагагічным калектывам.

Сенатар павіншаваў педагогаў, навучэнцаў гімназіі і бацькоў з пачаткам новага навучальнага года, першакласнікам уручыў кнігі — падарунак кіраўніка дзяржавы «Беларусь — наша Радзіма».

Падчас сустрэчы сенатара з педагогамі абмяркоўваліся актуальныя пытанні развіцця сістэмы адукацыі. Парламентарый адказаў на пытанні, якія датычыліся грамадзянска-патрыятычнага, працоўнага выхавання дзяцей і моладзі, а таксама расказаў аб заканатворчай дзейнасці Савета Рэспублікі.

Разам з парламентарыем удзел у святочных мерапрыемствах бралі намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Барысюк і намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама Іван Карабко.

А вось **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** разам з **членам Савета Рэспублікі, старшынёй Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталляй ЯКУБІЦКАЙ** завіталі ў сярэднюю школу № 1 ім. В. Ф. Купрэвіча, што ў Смалявічах.

Сенатары таксама прысутнічалі на цырымоніі адкрыцця школьнага стадыёна, які цалкам змяніўся пасля рамонту: абсталяваны футбольнае поле з мяккім пакрыццём, пляцоўка для валейбола, бегавыя дарожкі і ўсталяваны трэнажоры для занятку фізкультурай. Яшчэ адна навінка — уласная скейт-пляцоўка. Наведваць стадыён цяпер могуць як школьнікі, так і жыхары мікрараёна.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

АКТУАЛЬНА

# Масачны рэжым ніхто не адмяняў

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА правяла селектарную нараду з прадстаўнікамі сістэмы аховы здароўя па пытаннях процідзеяння распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі.**



Адзначым, што гэтыя пытанні знаходзяцца на асабістым кантролі Старшыні Савета Рэспублікі. Такія нарады сталі традыцыйнымі і праводзяцца штотыднёва.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, падчас канструктыўнай і дэталёвай размовы спікер Савета Рэспублікі абмеркавала з прадстаўнікамі Міністэрства аховы здароўя, установ аховы здароўя абласцей і сталіцы бягучую сітуацыю з захваральнасцю на COVID-19, функцыянаванне медыцынскіх устаноў краіны, меры эпідэмічнага рэагавання і выбудоўванне работы, у тым ліку з насельніцтвам.

Наталля Качанава паставіла задачу падрыхтаваць больш шырокі аналіз па катэгорыях прышчэпленых грамадзян і па захваральнасці на COVID-19 у дадзеных катэгорый. Таксама Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што масачны рэжым ніхто не адмяняў. А значыць, неабходна правяраць: як людзі носяць маскі ў крамах, транспарце, грамадскіх установах і гэтак далей.

— Кіраўніцтву сталіцы і іншых абласцей неабходна трымаць на пастаянным кантролі пытанні эпідэміялагічнага дабрабыту, — падкрэсліла яна.

Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя канстатавалі, што сёння ўсе службы функцыянуюць у штатным рэжыме, праблемных пытанняў няма.

# Размова па сутнасці

## Рэгіянальны форум «Беларусь адзіная» прайшоў у Навапалацку

**У ім узяў удзел намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ. Форум сабраў больш за 500 прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і палітычных партый.**



Цэнтральнымі тэмамі гутаркі, прысвечанай Году народнага адзінства, сталі развіццё інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі, маладзёжная палітыка, удзел бізнес-супольнасцяў у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, трансфармацыя палітычнай сістэмы Беларусі, неабходнасць і магчымыя шляхі пашырэння ўплыву палітычных партый на грамадска-палітычнае жыццё.

У якасці экспертаў выступалі дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вадзім Гігін, аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксандр Аўдонін, дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» Аляксандр Шпакоўскі, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, палітолаг Аляксей Дзермант і іншыя.